Дзяржаўная ўстанова культуры
"Цэнтралізаваная бібліятэчная сетка
Асіповіцкага раёна"
*Цэнтральная раённая бібліятэка*

*Серыя «Героі Савецкага Саюза – вызваліцелі Асіповіцкага раёна»*

# У ПАМЯЦІ НАШАЙ ГЕРОІ ЖЫВЫЯ



## КЛІМЕНКА Мікалай Іванавіч

# КЛІМЕНКА
# Мікалай Іванавіч

**(04.05.1911- 30.06.1944)**

## БІЯГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА



**Мікалай Кліменка – сібірак. Нарадзіўся 4 мая 1911 года ў вёсцы Міхайлаўка Венгероўскага раёна Новасібірскай вобласці, у сялянскай сям'і. Працаваў з 1926 года рабочым маслазавода. Уступіў у камсамол,праводзіў сярод насельніцтва грамадска-палітычную работу. З 1932 года - сакратар і старшыня выканкама сельскага Савета. Скончыў курсы пры Новасібірскам абкаме камсамола і прызначаны сакратаром Венгероўскага райкама камсамола. У час службы ў Чырвонай Арміі ў 1938 годзе быў прыняты ў члены ВКП(б). З мая 1941 года - парторг саўгаса "Тартарскі" Венгероўскага раёна Новасібірскай вобласці.**

**Праз некалькі дзён пасля пачатку Вялікай Айчыннай вайны, у ліпені 1941 года, Мікалай Кліменка прызваны ў Чырвоную Армію. Ужо з жніўня 1941 года ваяваў на фронце ў дзеючай арміі палітруком стралковай роты. Ваяваў на Заходнім, Сталінградскім, зноў на Заходнім, 1-м Беларускім**

**франтах. Заўсёды знаходзіўся на самых небяспечных участках бою.**

**Удзельнічаў у цяжкіх баях па абаронеСталінграда, дзе атрымаў першае раненне. Пасля выздараўлення камандаванне накіравала яго ў 1324 сапёрны полк. Разгром нямецка-фашысцкіх войскаў пад Сталінградам - пачатак масавага выгнання ворага за межы савецкай зямлі. У адным з баёў Мікалай Кліменка заўважыў, што разлік 76-міліметровай гарматы загінуў, а ворагі падступаюць да нашых войскаў. Мікалай Іванавіч адзін пачаў весці агонь па ворагу і знішчыў больш за 80 фашыстаў. У гэтым баі, 9 снежня 1943 года Кліменка другі раз атрымаў цяжкае раненне.**

**За бітву пад Сталінградам ён быў узнагароджаны медалямі "За адвагу" і "За абарону Сталінграда". Усяго адважны баец быў паранены пяць разоў і кожны раз вяртаўся з шпіталя ў строй.**

**Пасля шпіталя Мікалай Іванавіч прыняў удзел у акружэнні і ліквідацыі груповак праціўніка пад Бабруйскам. Намеснік камандзіра стралковага батальёна па палітычнай частцы 1324-га стралковага палка 413-й стралковай дывізіі 3-й арміі 1-га Беларускага фронту старэйшы лейтэнант Мікалай Іванавіч Кліменка здзейсніў гераічны подзвіг падчас Беларускай стратэгічнай наступальнай аперацыі і загінуў, абараняючы пераправу праз раку Свіслач.**




Пахаваны ў вёсцы Свіслач Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобласці. На Алеі Герояў у г.Асіповічы ўсталяваны помнік Мікалаю Кліменка.

За ўзорнае выкананне баявых заданняў камандавання на фронце барацьбы з германскім фашызмам і праяўленыя пры гэтым адвагу і гераізм, Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 24 сакавіка 1945 года старэйшаму лейтэнанту Кліменка Мікалаю Іванавічу пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Айчыннай вайны 2-й ступені, медалямі. Імем Героя названа вуліца ў вёсцы Венгерава Новасібірскай вобласці.

## ГІСТОРЫЯ ПОДЗВІГУ



У канцы чэрвеня 1944 года нашы войскі раптоўным і небывалым па сваёй моцы ўдарам узламалі абарону гітлераўскай групы армій “Цэнтр”і перамяшчаліся ўглыб Беларусі. У раёне Бабруйска 27 чэрвеня 1944 года была акружана40-тысячная групоўка ворага. Часці 413-й дывізіі атрымалі

загад не дапусціць прарыву гітлераўцаў з кальца на захад.

Мікалай Кліменка з групай байцоў ішоў у авангардзе наступаючых. 28 ліпеня батальён дайшоў да вёскі Зарэчча Бабрускага раёна Магілёўскай вобласці. У гэтым баі Кліменка падняў групу байцоў у атаку на варожых салдат, было знішчана болей 400 салдат праціўніка і 80 узята ў палон. У гэтым баі Мікалай Кліменка прадэманстраваў якасці ўмелага і смелага камандзіра.

Паступіла заданне батальёну старэйшага лейтэнанта М.Кліменка выбраць пазіцыюкаля мостапраз раку Свіслач Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобласці і трымаць абарону да падыходу падкраплення.

На працягу сутак 29 чэрвеня 1944 года было адбіта 12 нападаў ворага, які спрабаваў вырвацца з Бабруйскага “катла”. З паказанняў палонных стала вядома, што да моста сцякаюцца новыя нямецкія часці, колькасць ворага ўжо перавысіла склад пяхотнага палка. Было ясна, што вораг немінуча зробіць новыя атакі.

У гэтай сітуацыі камбат загадаў стварыць групу кулямётчыкаў у складзе трох кулямётных разлікаў (10 байцоў) і выйсці на высату наперадзе пазіцый батальёна і не даваць атакуючым прарвацца ў траншэі пехацінцаў.

На досвітку 30 ліпеня вораг пачаў новыя напады. Першую атаку фашыстаў кулямётчыкі адбілі. Поле перад вышынёй было ўсеяна варожымі трупамі. Але праціўнік зноў і зноў ірваўся да моста. Па вышыні адкрылі агонь варожыя мінамёты.

Кліменка быў паранены, але застаўся ў баі. Ён замяніў забіты разлік аднаго з кулямётаў і адбіў новую атаку. У наступныя гадзіны бою Мікалай Кліменка быў паранены яшчэ 2 разы, і зноў не сышоў з вышыні. Апошнюю атаку ён адбіваў ўжо адзін - усе кулямётчыкі загінулі ў няроўным баі. Старэйшы лейтэнант Кліменка адкрыў агонь з 50 метраў па пяхотнаму ланцугу ворага. Ён страляў, пакуль б'ецца сэрца.

К вечару падаспела падмацаванне і байцы перайшлі ў контратаку, адкінуўшыворага ад Бярэзіны. Цела адважнага зампаліта Мікалая Кліменкі было знойдзена на баявой пазіцыі. Мёртвы афіцэр працягваў сціскаць рукамі кулямёт. Перад вышынёй, дзе прынялі свой апошні бой 10 савецкіх воінаў, было сабрана больш за 200 трупаў гітлераўцаў. Ні адзін немец на гэтым рубяжы праз Бярэзіну не прайшоў. На наступны дзень, 1 ліпеня 1944 года, былі ўзяты ў плен апошнія часткі знішчанай бабруйскай групоўкі ворага.

# ЛІТАРАТУРА


1. Звёзды доблести ратной. – Новосибирск: Новосибирское кн. изд., 1986.
2. Клименко Николай Иванович – Герой Советского Союза, освобождал г.Осиповичи // Их именами названы… – Мн., 1987. -- С.272--273.
3. Клименко Н.И. // Герои Советского Союза : краткий биограф.словарь. В 2т. Т.1. –Мн., 1987. –С.663.
4. Клименко Н.И. – погиб возле д.Свислочь // Навечно в сердце народном. – Мн., 1984. – С.229.
5. Клименко Николай [Электронный ресурс] / Герои страны : интернет проект. – Минск, 2000–2013. – Режим доступа :http://www.warheroes.ru
6. Клименко Николай Иванович/ Электронный банк документов «Подвиг народа в Великой Отечественной войне 1941-1945 гг. – Режим доступа :http://www.podvignaroda.mil.ru